# ПРАВАВОЕ РЭГУЛЯВАННЕ ДЗЕЙНАСЦІ ПАЛІТЫЧНЫХ ПАРТЫЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

У.В. Ясеў

Уласцівай рысай сучаснага палітычнага працэса з'яўляецца імкненне да фарміравання дэмакратычных інстытутаў улады. Сучасныя ўяўленні аб дэмакратыі грунтуюцца на двух галоўных меркаваннях: удзел грамадзян у справах дзяржавы і спаборніцтва яе грамадскіх сіл. Менавіта на гэтым жа будуюцца дзеянні палітычных партый у дэмакратычных грамадствах.

У гісторыі палітычнай думкі мы знаходзім не толькі рознае разуменне сутнасці палітычных партый. але і іх месца ў палітычнай сістэме грамадства. Калі, напрыклад, М.А. Бярдзяеў лічыў, што ў той краіне, дзе адсутнічае шматпартыйнасць, правіць тыранія, то другі вядомы рускі філосаф І.А. Ільін адзначаў: дэмакратыя развальваецца менавита з прычыны яе партыйнай будовы. Такая супярэчлівасць з'яўляецца вынікам адноснай маладосці інстытута шматпартыйнасці. У развітых краінах Захаду ён налічвае каля ста гадоў.

Традыцыі прававога афармлення партый пачалі складацца пасля другой сусветнай вайны. Пры гэтым звычайна не праводзілася строгае юрыдычнае размежаванне партый і іншых грамадскіх аб'яднанняў. Агульным канстытуцыйным прынцыпам з'яўляецца свабода стварэння і ажыццяўлення дзейнасці палітычных партый. Такое права абвяшчаюць, напрыклад, артыкул 4 Канстытуцыі Французскай рэспублікі, артыкул 21 Канстытуцыі ФРГ, артыкул 49 Канстытуцыі Італьянскай рэспублікі.

У некаторых краінах (ФРГ, Партугалія, Іспанія) рэгламентацыя дзейнасці партый прыняла даволі дэталізаваны выгляд у выніку прыняцця спецыяльных законаў аб партыях і іх фінансаванні. Напрыклад, Закон аб палітычных партыях ФРГ вызначае месца партый у палітычнай сістэме краіны, прынцыпы іх арганізацыі, парадак удзелу партый у выбарах, пакрыццё выбарчых расходаў, парадак забароны партый у выпадку іх некастытуцыйнасці.

Існавала нарматыўнае рэгуляванне дзейнасці грамадскіх аб'яднанняў і ў былым СССР. Так, артыкул 51 Канстытуцыі СССР 1977 г. прадугледжваў права грамадзян



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

на аб'яднанне ў грамадскія арганізацыі, якія садзейнічаюць развіццю палітычнай актыўнасці і самадзейнасці, задавальненню іх разнастайных інтарэсаў. У гэтым жа артыкуле было адзначана, што такое аб'яднанне магчыма толькі ў адпаведнасці з мэтамі будаўніцтва камунізму.

Артыкул 6 Канстытуцыі БССР 1979 г. абвяшчаў права палітычных партый удзельнічаць у выпрацоўцы палітычнага курсу рэспублікі праз сваіх прадстаўнікоў, якія абраны ў Саветы народных дэпутатаў.

У адпаведнасці з Законам СССР "Аб грамадскіх аб'яднаннях" 1991 г. палітычныя арганізацыі разглядаліся як адна з форм грамадскіх аб'яднанняў. Яны атрымлівалі права ўдзельнічаць у фарміраванні органаў дзяржаўнай улады і кіравання, ажыццяўляць заканадаўчую ініцыятыву. Разам з тым, адсутнічаў дакладны механізм узаемадзеянняў органаў дзяржаўнай улады і палітычных партый.

Змяненне ролі і ўмоў дзейнасці партый у сучаснай Беларусі выклікае неабходнасць вызначэння іх новага юрыдычнага статуса, выпрацоўкі механізму іх больш эфектыўнага ўключэння ў палітычную сістэму грамадства. Аднак пераходны характар палітычнага рэжыму выклікае крытычныя адносіны да палітычных структур і палітычных ідэалогій. У першую чаргу гэта тычыцца палітычных партый. У выніку працэс легалізацыі партый на Беларусі набывае супярэчлівую форму, калі адначасова можна назіраць як спробы ігнаравання і абмежавання іх дзейнасці з боку дзяржавы, так і спробы інкарпарыраваць партыі ў палітычную сістэму грамадства.

На працягу 4 год заканадаўства рэспублікі не вызначала месца партый у палітычным працэсе. Разам з тым працэс стварэння грамадскіх аб'яднанняў набыў дынамічны характар. *Калі ў 1991 г. было зарэгістравана 5 палітычных партый*, то на канец 1994 г. - 29.

Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь 1994 г. заклала прававую аснову дзейнасці палітычных партый. Яна вызначае ў якасці складанай часткі існуючага палітычнага рэжыму магчымасць існавання палітычных партый, асноўная функцыя якіх садзейнічаць выяўленню і выражэнню палітычнай волі грамадзян праз удзел у выбарах.

Найбольш дэталёва дзейнасць партый рэгламентуецца "Законам аб палітычных партыях", які, дарэчы, з'явіўся ўпершыню ў сістэме рэспубліканскага заканадаўства.

Заканадаўства вызначае партыі з сістэмы іншых грамадскіх аб'яднанняў, дзейнасць якіх рэгулюецца асобнымі заканадаўчымі актамі. Грамадзяне атрымліваюць права на ўтварэнне палітычных партый. Дзяржава са свайго боку гарантуе абарону правоў і інтарэсаў членаў партый, стварэнне ўмоў для выканання імі статутных мэт і задач. Ажыццяўляюць свае мэты і задачы партыі праз права

- свабодна распаўсюджваць інфармацыю аб сваёй дзейнасці і прапагандаваць свае ідэі;
- утвараць свае друкаваныя выданні, альбо карыстацца дзяржаўнымі сродкамі масавай інфармацыі;
- праводзіць мітынгі, дэманстрацыі і іншыя масавыя мерапрыемствы ў парадку, устаноўленым заканадаўствам;
- удзельнічаць у правядзенні выбараў, вылучаць сваіх кандыдатаў, ствараць выбарчыя блокі;

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

- праз сваіх прадстаўнікоў у выбарных дзяржаўных органах уплываць на працэс прыняцця палітычных рашэнняў;
- падтрымліваць сувязі з іншымі палітычнымі партыямі.

Сярод асноўных прынцыпаў арганізацыі палітычных партый Беларусі законам прадугледжана свабода асацыяцый, дэмакратызм, самакіраванне. законнасць і раўнапраў'е ўсіх партый. Ідэалогія якой-небудзь партыі не можа ўстанаўлівацца ў якасці абавязковай для ўсіх грамадзян. а партыйная будова ідзе выключна па тэрытарыяльнаму прынцыпу. Партыя вызначаецца як суб'ект права, а калектыўнае членства забараняецца.

Адна з найбольш важных праблем у дзейнасці палітычных партый - праблема іх фінанасавання. У першую чаргу яна звязана з актыўным удзелам партый у выбарах. Закон прадугледжвае сярод крыніц сродкаў беларускіх партый уступныя і членскія ўзносы, даходы ад выдавецкай дзейнасці і правядзення партыйных мерапрыемстваў, ахвяраванні. Разам з тым забараняецца фінансаванне партый з дзяржаўнага бюджэту рэспублікі, а таксама з боку замежных дзяржаў, міжнародных арганізацый, замежных грамадзян.

Дэмакратычная традыцыя прадугледжвае, што рэгістрацыя партый утрымлівае не палітычны, а прававы сэнс і, звычайна, прымае заявачны характар. Але, калі, напрыклад, артыкул 4 Канстытуцыі Францыі залічвае партыі ў разрад асацыяцый, якія ствараюцца без усялякіх фармальнасцей і рэгістрацыі, без аб'явы сваіх мэт, то Закон Рэспублікі Беларусь патрабуе, каб не менш 500 грамадзян, якія дасягнулі 18-гадовага ўзросту і валодаюць выбарчым правам, выступілі ў якасці заснавальнікаў партыі. Для рэгістрацыі неабходна падать статут, праграму партыі, пратакол устаноўчага з'езду, звесткі аб членах выбарных органаў партыі і г.д. Артыкул 15 дае магчымасць адкласці рэгістрацыю партыі на тэрмін да трох месяцаў.

Закон устанаўлівае пракурорскі нагляд за дзейнасцю палітычных партый, а таксама контроль за імі з боку Міністэрства юстыцыі, службовыя асобы якога не толькі рэгіструюць партыі, але і вызначаюць адпаведнасць іх дзейнасці статуту і праграме, колькасны састаў. У выніку органы выканаўчай улады атрымліваюць права тлумачэння Канстытуцыі і шэрагу іншых законаў Рэспублікі Беларусь, якое, на нашу думку, павінна належыць органам судовай улады. Акрамя таго, у выканаўчай улады з'яўляецца магчымасць уплываць на выбарчую барацьбу праз скарыстанне патрабавання абавязковага перарэгістравання партый да красавіка 1995 г.

Растаноўка і характар дзейнасці партыйных сіл шмат у чым абумоўлены самім парадкам выбараў. У шэрагу праблем, якія распрацаваны французскімі палітолагамі, важнае месца займае праблема спосабу галасавання як аднаго з ключавых элементаў палітычнага рэжыму. Спецыфіка выбарчай сістэмы можа вызначаць контуры палітычнай сістэмы. Вядомы даследчык М. Дзювяржэ вызначыў заканамернасці ўплыву спосабу галасавання на партыйную інфраструктуру. Так, мажарытарная сістэма выбараў у два туры, а менавіта такая сістэма дзейнічае ў Рэспубліцы Беларусь, спрыяе ўтварэнню шматпартыйнай сістэмы, якая складаецца з партый са слабай структурай. У выніку яны залежаць адна ад другой. Дадатковыя цяжкасці атрымаюць партыі Беларусі ў выбарчых акругах, якія будуць утвораны ў межах адміністратыўных адзі-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

нак, дзе мясцовыя органы юстыцыі не ўзялі на ўлік арганізацыйныя структуры партый.

Грамадства набывае новую палітычную структуру і шматпартыйнасць як інстытут фарміравання ўлады праходзіць неабходныя стадыі развіцця. Палітычныя партыі Рэспублікі Беларусь атрымалі прававую аснову сваёй дзейнасці. Відавочна, што сістэма нарматыўнага рэгулявання дзейнасці грамадска-палітычных аб'яднанняў паўплывае не толькі на сучасны стан партыйнай сістэмы рэспублікі, але і на яе эвалюцыю. Узрасце роля партый у парламенцкай дзейнасці як вынік актывізацыі іх у выбарчай барацьбе, а працэс фарміравання парламенцкіх фракцый набудзе больш дакладна акрэслены характар. Зменіцца колькасць палітычных партый. Шэраг іх будзе вымушаны пайсці на ўтварэнне партыйных блокаў, альбо зліцца з блізкімі па праграмным мэтам і задачам. Такім чынам, шматпартыйнасць, будзем спадзявацца, стане прыкметай больш высокай ступені дэмакратычнасці нашага грамадства.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова